# Ён пісаў гісторыю беларускага мастацтва...



**26 лістапада — 75 гадоў з дня нараджэння У.С.Караткевіча (1930—1984)**

На думку А.Мальдзіса, У.Караткевіч узвысіўся, стаў эпахальнай з'явай не толькі ў гісторыі беларускай літаратуры і культуры, але і ў фарміраванні нацыянальна-гістарычнай свядомасці беларусаў.

Нарадзіўся Уладзімір Сямёнавіч у Оршы ў сям'і чыноўніка, духоўная атмасфера якой спрыяла развіццю будучага пісьменніка. Як і сотням тысяч сваіх аднагодкаў, У.Караткевічу давялося спазнаць жахі вайны. Пасля яе пераможнага завяршэння ён вучыўся на філалагічным факультэце Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта (1949—1954). У 1954—1956 гадах настаўнічаў спачатку ў сельскай школе непадалёку ад Кіева, затым у Оршы. Пазней, у 1958—1962 гадах, была цікавая, поўная ўражанняў і мастацкага пошуку вучоба на Вышэйшых літаратурных, а потым сцэнарных курсах у Маскве.

Жыццёвае і творчае сталенне У.Караткевіча праходзіла пераважна ў Расіі і на Украіне, дзе ён арганічна засвойваў здабыткі блізкіх культур, авалодваў украінскай, рускай, польскай і французскай мовамі. На Беларусь пісьменнік вярнуўся ўжо вялікім эрудытам, інтэлектуалам, у якім жыла арганічная цікавасць да ўсяго, што адбывалася і адбываецца ў свеце. Падчас вучобы на курсах у яго наладзіліся сяброўскія адносіны з лепшымі, пераважна «андэграўнднымі» літаратарамі Літвы і Латвіі, Грузіі і Арменіі. У.Караткевіч быў жаданым госцем у рэдакцыях маскоўскіх часопісаў і майстэрнях рускіх авангардыстаў. Далучанасць да славянскай, еўрапейскай, сусветнай цывілізацый дазволіла яму хутка

стаць вядучым беларускім пісьменнікам. У 1954 годзе ён упершыню ўдзельнічаў у рэспубліканскай нарадзе маладых літаратараў. У беларускіх перыядычных выданнях пачалі друкавацца яго вершы, заўважаныя і высока ацэненыя крытыкай, а ў кнізе «Янка Купала. Зборнік матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці паэта» быў змешчаны нарыс «Вязынка». Пачынаючага літаратара ў красавіку 1957 года прынялі ў Саюз пісьменнікаў БССР, што значна актывізавала яго творчую дзейнасць. Як вынік, выхад у свет першых паэтычных зборнікаў «Матчына душа» (1958) і «Вячэрнія ветразі» (1960).

У асобе маладога аўтара беларуская паэзія набыла яркае і самабытнае дараванне, поўнае паэтычнай узнёсласці, смелай метафарычнасці і глыбіні. Багатая і разнастайная паэтычная творчасць У.Караткевіча прасякнута любоўю да роднай зямлі і свайго народа. У вершах ён імкнуўся аднавіць гераічныя і трагічныя старонкі гісторыі, выкласці на паперы паданні, «казку мудрую, простую песню, кветку матчынай чыстай душы». Гістарычны аспект у творчасці У.Караткевіча з'яўляецца надзвычай істотным. Паэт спрабаваў асэнсаваць месца беларусаў, моц і бяссмерце якіх бачыў у дзейнасці Скарыны, Каліноўскага, Багдановіча і іншых выдатных асоб, сярод іншых народаў свету. У 1969 годзе выдадзены зборнік паэзіі «Мая Іліяда». Сабраныя разам неапублікаваныя вершы паэта склалі яго пасмяротны зборнік «Быў. Ёсць. Буду» (1986), які ператварыўся ў паэтычны запавет наступным пакаленням, створаны трапяткой рукой майстра, напоўнены мудрымі высновамі жыцця.

Несумненна, паэзія ўвесь час суправаджала талент Уладзіміра Сямёнавіча, жыла ў ім нават тады, калі ён працаваў над празаічнымі творамі. У Маскве ўзнік замысел першага рамана «Леаніды не вернуцца на Зямлю», які пазней атрымаў назву «Нельга забыць» і быў надрукаваны ў часопісе «Полымя» ў 1962 годзе (у 1983 годзе твор адзначаны Літаратурнай прэміяй імя І.Мележа). Гэты раман мае выразныя прыкметы сацыяльна-філасофскай, інтэлектуальнай і сацыяльна-псіхалагічнай прозы. Вуснамі галоўнага героя пісьменнік выказаў у ім сваю творчую праграму: «...Мы напішам першую сапраўдную гісторыю беларускага мастацтва. Гэта цяжка. Нам давядзецца аб'ездзіць разам усю Беларусь, адшукваць тое, што забыта, вывучаць, біць у набат, калі штосьці занядбалі або бураць. Гэта будзе сумленная гісторыя. Яна не будзе забываць ні добрага, ні дрэннага... Ты прыкладзеш да гэтай кнігі веды, а я так выкладу яе, каб яна чыталася запоем, як легенда...». Менавіта гэтаму ён і прысвяціў усё сваё жыццё. У першы празаічны зборнік У.Караткевіча «Блакіт і золата дня» (1961) увайшлі гістарычныя аповесці «Сівая легенда», паводле якой ён стварыў лібрэта да оперы Д.Смольскага, і «Цыганскі кароль». Яны засведчылі, што пісьменнік не проста выдатна ведае мінулае свайго народа, але і ўмее ўзнаўляць яго, «рэстаўрыраваць» у яркіх мастацкіх вобразах. Праграмным творам, пабудаваным на дакументальным матэрыяле паўстання 1863 года пад кіраўніцтвам К.Каліноўскага, з'яўляецца раман «Каласы пад сярпом тваім» (1965). На яго старонках адлюстраваны Беларусь 60-х гадоў XIX стагоддзя і сацыяльны зрэз тагачаснага грамадства. Задачы, пастаўленыя мастаком у «Каласах...», знайшлі частковае вырашэнне ў драме «Кастусь Каліноўскі», дзе паказаны падзеі самога паўстання. Сярод твораў гістарычнага зместу вылучаецца раман «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (1966) – шырокае палатно, «народная драма» з жыцця сярэдневяковай Беларусі, твор глыбока філасофскі. Да рамана тыпалагічна блізкая легенда «Ладдзя Роспачы» (1964), своеасаблівы і арыгінальны твор, у якім услаўляецца асоба, вызваленая ад пут сярэднявечча.

У.Караткевіч не толькі карпатліва вывучаў гісторыю і сучаснае жыццё беларускага народа, але і імкнуўся пазнаёміцца з новымі мясцінамі. Амаль кожнае з падарожжаў (Далёкі Усход, Сярэдняя Азія,

Урал, Грузія, Прыбалтыка, Польшча, Чэхаславакія і іншыя краіны) было пакладзена ў аснову літаратурнага твора. Так, пасля паездкі на Далёкі Усход з'явілася аповесць «Чазенія», палескія ўражанні сталі асновай для шэрага апавяданняў, а жыццё ў Кіеве – для аўтабіяграфічнай аповесці «Лісце каштанаў», што ўвайшла ў зборнік «Вока тайфуна» (1974). Але найчасцей шляхі вандраванняў вялі пісьменніка ў беларускія гарады і вёскі, туды, дзе можна было пачуць трапнае слова, яшчэ не вядомую шырокаму колу людзей песню... Запісныя кніжкі У.Караткевіча «У дарозе і дома», надрукаваныя ў трох першых нумарах «Полымя» за 1989 год, дазваляюць лепш зразумець, чаму нарадзіліся «Казкі Янтарнай краіны», «Краіна Цыганія», «Мсціслаў» і «візітная картка Беларусі» – «Зямля пад белымі крыламі».

З пастаяннай і асаблівай прыхільнасцю Уладзімір Сямёнавіч адносіўся да жанру гістарычнага дэтэктыва. Сведчаннем плённых пошукаў пісьменніка, якія дазволілі яму, з аднаго боку, пазбегнуць гатовых штампаў, а з другога – пісаць гісторыю роднай краіны, з'яўляюцца такія гістарычна-прыгодніцкія творы, як аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха» (1964) і раман «Чорны замак Альшанскі» (1979–1980), за які ў 1984 годзе майстар атрымаў Дзяржаўную прэмію БССР імя Якуба Коласа. Створаныя ў адпаведнасці з правіламі рамантычна-прыгодніцкай літаратуры, яны сталі адкрыццём у сучаснай беларускай літаратуры, у першую чаргу, яе дэтэктыўна-прыгодніцкім кірунку.

У 70-я гады да Караткевіча прыйшла слава драматурга. У 1974 годзе на сцэне Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа з поспехам была пастаўлена п'еса «Званы Віцебска» (рэж. В.Мазынскі), у якой аўтар звярнуўся да падзей Віцебскага паўстання 1623 года. 1978 год адзначаны прэм'ерай драматычнага твора «Кастусь Каліноўскі». Да 100-годдзя з дня нараджэння беларускага песняра Янкі Купалы была прымеркавана п'еса «Калыска чатырох чараўніц» (1981), з якой гледачы пазнаёміліся на сцэне ТЮГа. Падзеям Крычаўскага паўстання 1743–1744 гадоў драматург прысвяціў трагедыю «Маці ўрагану», створаную ў 1982-м і ўпершыню пастаўленую мінскім аматарскім тэатрам «Золак» у 1988 годзе.

Як аўтар шматлікіх нарысаў і эсэ У.Караткевіч пакінуў прыкметны след у публіцыстыцы і літаратурнай крытыцы. На працягу ўсёй творчай дзейнасці ён звяртаўся да мастацкага перакладу, пісаў сцэнарыі дакументальных і мастацкіх фільмаў. У літаратурнай спадчыне пісьменніка захаваліся малюнкі і ілюстрацыі да ўласных твораў.

Вялікай стратай для беларускай літаратуры стала заўчасная смерць творцы 23 ліпеня 1984 года. «Беларусь даўно чакала такога пісьменніка. І радасна, што ён прыйшоў. І горка, балюча, што ён не змог, не паспеў разгарнуцца яшчэ больш глыбока і шчодра», – адзначыў Я.Брыль у сваім эсэ «Наш Караткевіч». Але творчая спадчына, пакінутая таленавітым майстаком слова, і сёння выклікае ў яго суайчыннікаў пачуццё мастацкай асалоды, захапленне непаўторнасцю індывідуальнага аўтарскага стылю, гонар і пашану. Сведчаннем шырокага грамадскага прызнання У.Караткевіча з'яўляюцца пераклады яго твораў на шматлікія мовы народаў свету. У 1980 годзе заслугі пісьменніка былі адзначаны высокай дзяржаўнай узнагародай – ордэнам Дружбы народаў. Яго іменем названы Фонд дапамогі маладым пісьменнікам, прэмія выдавецтва «Мастацкая літаратура». Увасабленнем нацыянальнай любові сталі помнікі У.Караткевічу, устаноўленыя ў Оршы і Віцебску.

***К.Д.Варанько,*** *галоўны бібліёграф*
*Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*